## 33. ДУБ З БЯРОЗАЙ

Выратуйце майго мужа! Яго нізавошта могуць пасадзіць у турму за спробу згвалтавання. Ён не вінаваты. Упэўнена, што ён гэтага не рабіў. Ён не мог мне здрадзіць. Я веру свайму мужу, таму што люблю яго, а ён любіць мяне. Яму адпомсцілі за тое, што змагаўся са злодзеямі на плодаагароднінінай базе. Дапамажыце ўстанавіць справядлівасць. Хутка суд, я не веру суддзі гэтак жа, як і следчаму. Я веру свайму мужу!

Такім быў пафас жаночага паслання ў рэдакцыю "Литературной газеты". Паўнюткі сшытак. Раман пра вернае каханне, напісаны шчыра і падрабязна. Як паўгода сустракаліся і да шлюбу зберагалі нявіннасць. Як пажаніліся і на месяц паехалі на рэчку Убарць каля Петрыкава, дзе жылі ў палатцы і дзе пакляліся ў вечнай вернасці. Як праз дзевяць месяцаў пасля Убарці нарадзіліся двайняткі – хлопчык і дзяўчынка. Як муж клапоціцца аб дзецях і жонцы. Які ён добры, лепшы за ўсіх, у чым яна ўпэўнілася за дзесяць гадоў сумеснага жыцця.

Не вер каню ў дарозе, а жонцы – нават дома. Так кажуць у народзе, відаць, маючы на тое рацыю.

Пра мужа кажуць, што гадок прабыў дый кабету забыў. А калі не гадок, а дзесяць? І калі працуеш на плодаагароднінінай базе і вакол цябе маладыя дзяўчаты ў кароценькіх напаўрасшпіленых халатах, і не адна стрэліць у цябе, трыццаціпяцігадовага мужчыну, смелым позіркам, перабіраючы абрыдлыя памідоры?

Пасля сустрэчы з абвінавачаным, прызнаюся, адчуў пэўны скепсіс да жаночай веры ў ягоную бязгрэшнасць. Надта ж многа было вакол мужчыны жаночай спакусы, і, хто ведае, можа, ухапіў, справа жыццёвая, звычайная. Жонка заўсёды даведваецца апошняй, як, дарэчы, і муж пра жонку.

Ён працаваў намеснікам начальніка базы. Прымаў на працу, дзяліў прэміі і пуцёўкі, узначальваў камісію па праверцы магазінаў базы. Ад яго залежалі ўсе тыя дзяўчаты ў халаціках на беленькія трусікі.

Па версіі пацярпелай, загадчыцы магазіна, ён паклікаў яе ў кабінет і ў абмен на скасаваны акт праверкі яе магазіна прапанаваў тут жа, у кабінеце, уступіць з ім у палавыя зносіны. Яна горда адмовілася. Ён паспрабаваў узяць сілай. Яна вырвалася, уцякла. У калідоры сустрэла жанчыну, якая цяпер, на стадыі папярэдняга следства, была і сведкай, і таксама пацярпелай, бо тое ж самае ён раней паспрабаваў зрабіць і з ёю, а займаецца ён гэтым даўно, многія дзяўчаты пабывалі пад ім, ды маўчаць, саромеюцца прызнацца.

Следчы, які займаўся справай, сказаў мне, што, акрамя сведкі, маюцца рэчавыя доказы: разарваная кофтачка жанчыны, адбіткі яе пальцаў на дзвярной ручцы кабінета, а на гузіку ейнай кофты – адбіткі ягоных пальцаў.

Па версіі абвінавачанага, падзеі ў кабінеце разгортваліся інакш. Ён выклікаў загадчыцу пазнаёміцца з актам праверкі магазіна, у якім была выяўлена значная недастача тавару. Ён зачытаў акт. Яна самлела, папрасіла вады. Ён паднёс вады. Яна сказала: расшпілі гузік, задыхаюся. Затым ускочыла, заенчыла. Пабегла ў калідор.

Паспрабуй разбярыся, што адбылося на самай справе! Тое, што адбываецца паміж мужчынам і жанчынай, ведаюць толькі яны. Калі хочаце ведаць і вы – глядзіце ў замочную шчыліну або парнаграфічны фільм. Калі вы юрыст і хочаце разабрацца, па згодзе ці па прымусу тое было, я вам не зайздрошчу. А вы, вядома, не зайздросціце журналісту, які ўздумаў расследаваць, на чым трымаецца непахісная вера жанчыны ў свайго мужа. Чаму ты так верыш яму, дурная пастарэлая жонка?

Стараюся педантычна выконваць залатое правіла журналісцкай этыкі і перасцярогі: сустракаюся з усімі ўдзельнікамі канфлікту. Для размоў знайшоў, на мой погляд, зручнае месца – у аўтамабілі карпункта "ЛГ". Не замінаюць ані тэлефоны, ані людзі. Па дамове прыязджаеш да чалавека на працу, запрашаеш у машыну. Чалавеку зручна, бо не трэба нікуды ехаць, траціць час. Ён паважае цябе за тое, што ты да яго прыехаў, і таму будзе больш шчыры.

Садзімся з суразмоўцам на задняе сядзенне, а на пярэднім, на сваім месцы, перагортваючы газету і быццам бы не звяртаючы на нас увагі, сядзіць шафёр Коля Жураўлёў. Абавязковая ўмова! Выпакутавана практыкай. Здаралася, пасля суразмоўца адракаўся ад сваіх слоў, абвінавачваў журналіста ў тэндэнцыйнасці, шантажы. Шафёр Коля – сведка, ён дысцыплінуе і цябе, і твайго госця. А госцю, каб не забываў размову з журналістам, я, быццам зануда-следчы, даваў пачытаць у сваім блакноце сказанае ім і прасіў распісацца на кожнай старонцы. Выручала не аднойчы.

Пазваніўшы пацярпелай, я дамовіўся аб сустрэчы ў машыне каля плодаагародніннага магазіна. Прыехалі за пяць мінут да прызначанага часу, чакалі мінут трыццаць. Думаў, што не прыйдзе. Ды нарэшце адчыняюцца дзверы мгазіна – і да нашага аўто накіроўваецца жанчына, пра якую ў народзе кажуць: усё – пры ёй! Галоўнае дасягненне нашага гандлю і ёсць эфектныя жанчыны. Пакуль не адкрые рот і не скажа афарызм: вас мога, а я адна.

Села побач, агаліўшы прыгожыя ногі. Спытала на трасянцы: "Что вы хаціце, мальчыкі?"

І ў мяне маланкава нарадзіўся план. Я папрасіў шафёра ... выйсці з машыны. Але не адыходзіць далёка, стаяць каля дзвярэй. Навошта я застаўся з прыгажуняй сам-насам? Хутка зразумееце.

Яна расказала мне тое, што я чытаў у дакументах следства. Пра намесніка начальніка базы гаварыла так: "Он предложил стать вместе».

–Як гэта разумець? – спытаў я.

–А вы ешчо мальчык, не панимаеце?

Скончыўшы інтэрв'ю, я даў ёй ручку і блакнот. Яна распісалася на кожнай старонцы. Вяртаючы мне журналісцкія прычындалы, дакранулася да мяне каленцам. Спытала шматзначна: "Всё?"

Я падзякаваў за размову, выпусціў яе з машыны. І яна пайшла ў свой магазін прыхарошваць сабой яго бедны асартымент. Шафёр сеў на месца, па-мужчынску мне падміргнуў: "Класс-бабёнка!"

Праз тыдзень мне пазванілі з Масквы, з рэдакцыі. Зачыталі яе пісьмо. “Класс-бабёнка” скардзілася, што карэспандэнт “предложил стать вместе”.

Мой план удаўся. Цяпер я ведаў, што адбылося ў кабінеце намесніка. Я паверыў ягонай жонцы.

Эксперымент на сабе – рэч небяспечная. Адмыцца ад плёткі сэкс—правакатаркі мне было лягчэй, яе кофтачку я не парваў, шафёр бачыў і пацвердзіў.

На судзе я прысутнічаў у якасці сведкі з боку абвінавачанага. Мой неабвержны, як мне здавалася, аргумент у невінаватасці намесніка начальніка базы быў наступным: загадчыца магазіна абылгала яго, як і мяне. Хіба не лагічна? Суддзя парыраваў, што абстрактна-разумовае заключэнне – прэрагатыва інжынераў чалавечых душ, а не юрыспрудэнцыі. І прадаўжаў весці працэс па сваёй методыцы высвятлення ісціны.

У жонкі абвінавачанага суддзя спытаў:

–Да шлюбу у вас была фізічная блізкасць з мужам?

–Не.

–А ён прапаноўваў?

–Так.

–Чаму ж не было?

–Таму што ён кахаў мяне! Таму што я папрасіла: пасля. Таму што … не вашая справа, як у нас было!

Суддзя папярэддзіў, што трэба паважаць суд, і працягваў роспыт жонкі-сведкі?

–Скажыце, ваш фізічны кантакт наступае адразу ці пасля папярэдняга ласкання?

–Не выварочвайце мне душу! – папрасіла жанчына.

–Зразумейце адно, сведка! – строга спыніў суддзя. – Сваёй дакладнасцю і шчырасцю вы дапаможаце суду вызначыць ісціну і, можа, выратаваць абвінавачанага. Нам патрэбна ўстанавіць тыповы малюнак яго сексуальных паводзін. Па аналогіі. Пытаюся яшчэ раз: у вашага мужа эрэкцыя наступае адразу ці пасля вашай дапамогі?

–Дзе ваш сорам? —- прашаптала жанчына.

–Не сараматіце мяне! Я – суддзя. Прызнаю толькі рэчавыя доказы і паказанні сведак. Больш спытаць няма ў каго, таму я пытаюся ў вас.

–Спытайце ў дуба і бярозы! – у адчаі выкрыкнула жанчына. – Яны вам скажуць пра нашу любоў. Мы імі пакляліся…

Жанчына зарыдала ў істэрыцы. Суддзя перапыніў працэс.

У перапынку я спытаў у жанчыны, што яна мела на ўвазе, гаворачы пра нейкія дрэвы. Высветлілася, што тады, у мядовы месяц, сваю палатку яны паставілі пад дубам і бярозай на беразе Убарці. Дрэвы спляліся, як у каханні, і ніколі ім не раз’яднацца. Шлюбны знак! Тады, у палатцы, у першыя бяссонныя

ночы, яны ведалі, што ў іх абавязкова народдзяцца сын і дачка, двайняткі, як дубок і бярозка, якія ўсю ноч шапочуць над іхнімі галовамі...

Суддзя не пачуў шэпту сумленных сведак кахання і вернасці. Таму я рэдка веру прыгаворам суддзяў.

Муж быў асуджаны за неаднаразовыя спробы згвалтавання, тры гады правёў у турме. Невінаваты. Шайка злодзеяў засталася непакаранай.

Слухайце дрэвы, мужчыны і жанчыны. Калі пачуеце – яны скажуць вам пра вас такое добрае, чаго вы і самі не ведаеце. Прыхініцеся спінай да сонечнай меднастволай сасны, знайдзіце яе рытм, прыслухайцеся да вершаліны – вы адчуеце, як з вас выходзіць назапашаны цынізм.

А з дубам трэба гаварыць далонямі: прыкладзіце іх да магутнага ствала – пачуеце, як да вас вяртаецца ўпэўненасць, як развейваюцца вашы комплексы.

Белую бярозу паспрабуйце пагладзіць па лісціках-валасах – да вас прыйдзе прага пяшчоты і любові.

Слухайце лес. Ён падобны на чалавецтва, але ён не робіць гэтулькі памылак.

1995-2005

www.kamunikat.org